Падтрымай "Вясну" на PATREON

Пяць гадоў калоніі — пракурор запрасіў пакаранне для палітвязня Мікалая Дзядка

дапоўнена

03.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні **Асобы**: Мікола Дзядок

У Мінскім гарадскім судзе 3 лістапада аднавіўся суд па крымінальнай справы супраць 33-гадовага палітзняволенага блогера і актывіста анархічнага руху Мікалая Дзядка. Чатыры месяцы таму па справе прызначылі судовую псіха-лінгвістычную экспертызу, якая праводзілася гэтыя месяцы. Сёння адбыліся судовыя спрэчкі, на якіх для палітвязня запрасілі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на пяць гадоў у калоніі агульнага рэжыму. Нагадаем, Мікалая затрымалі 11 лістапада, моцна збілі і выставілі абвінавачванне па трох артыкулах Крымінальнага кодэкса: арт. 342, арт. 361, арт. 295-3. На судзе ён падрабязна распавёў пра гэта. Мікола не прызнаў віну ні па ніводным артыкуле. Справу разглядае суддзя Анастасія Папко, дзяржабвінавачванне падтрымлівае пракурор Антон Цюменцаў.



Мікалай Дзядок у судзе. Фота: spring96.org

Суд пачаўся з паведамлення пра мінаванне будынку

Працэс быў прызначаны на 10 гадзін, але ў час ён не пачаўся праз паведамленне **пра мініраванне будынку суда.** Пасля праверкі сапёрамі ў будынак суда запусцілі людзей. Суд пачаўся са спазненнем на 45 хвілін.

Што сказала экспертыза?

6 ліпеня суддзя Анастасія Папко прыняла рашэнне прызначыць па справе Мікалая Дзядка судовую комплексную псіха-лінгвістычную экспертызу па матэрыялах **(каля 20 пастоў, размешчаных з жніўня па кастрычнік мінулага года)**, размешчаных у тэлеграм-канал "**Mikola**" на наяўнасць, у тым ліку, прыкметаў распальванні варожасці. Экспертызу даручылі правесці экспертам з Дзяржаўнага камітэту судовых экспертызаў.

На вырашэнне экспертаў былі пастаўленыя наступныя пытанні і атрыманыя адказы:

1. Ці ўтрымліваюцца ў размяшчаных Дзядком тэкстах у тэлеграм-канале "Mikola" [пералічваюцца пасты з жніўня па кастрычніка] выказванні, у якіх негатыўна ацэньваецца чалавек альбо група асоб, аб'яднаных па прыкмеце прафесійнай прыналежнасці: супрацоўнікі органаў унутраных спраў, у тым ліку АМАПа і дзяржаўных служачых? ***— утрымліваюцца.***
2. Ці ўтрымліваюцца ў прадстаўленых на даследаванне тэкстах выказванні пабуджальнага характару, якія заклікаюць да гвалтоўных дзеянняў, дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды адной групы асобаў у дачыненні да іншай групы асоб, аб'яднаных па прыкмеце прафесійнай прыналежнасці: супрацоўнікі органаў унутраных спраў, у тым ліку АМАПа і дзяржаўных служачых? ***— утрымліваюцца.***
3. Ці ўтрымліваюцца ў тэкстах выказванні, якія заклікаюць да прычынення шкоды маёмасці, якая належыць групе асобаў, аб'яднаных па прыкмеце прафесійнай прыналежнасці: супрацоўнікі органаў унутраных спраў, у тым ліку АМАПа і дзяржаўных служачых? ***— утрымліваюцца.***
4. Якая псіхалагічная накіраванасць тэкстаў, накіраваных на даследаванне? ***— выказванні маюць рэкамендацыйны характар, пабуджальныя выказванні другасныя.***

За ўдзел у Маршы "Мінсктранс" выставіў пазоў

За ўдзел у Маршы 23 жніўня мінулага года Мікалаю прад'яўляюць, што ён блакаваў рух транспарту з 14:00 па 16:15 гадзін шляхам выхаду на праезную частку, чым нанёс маёмасны ўрон "Мінсктрансу" ў памеры **5 772 рублёў 7 капеек**. Доказ блакавання дарогі — фотаздымак Мікалая з Марша, які знаходзіўся на яго ноўтбуку.

Мікалай не прызнае пазоўныя патрабаванні ў поўным аб'ёме. Як ён сцвярджае, незразумела, як менавіта яго дзеяннямі адбылася блакаванне руху і час выходзіць за рамкі яго прысутнасці на дарозе.

Судовыя спрэчкі

Пракурор Антон Цюменцаў у судовых спрэчках заявіў, што віна Мікалая Дзядка па `арт. 342`, `арт. 361`, `арт. 295-3` Крымінальнага кодэкса цалкам даказаная і просіць суд прызначыць палітвязню пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на **пяць гадоў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму:**

- па ч. 1 арт. 342 КК — два года калоніі;
- па арт. 295-3 КК — два года калоніі;
- па арт. 361 КК — 4,5 года калоніі.

Адвакатка не бачыць у дзеяннях Мікалая склады злачынстваў, таму просіць апраўдаць яго.

Палітвязень: Мы ўсё роўна пераможам

Мікалай Дзядок сёння выступіў з апошнім словам:

> *"Усе ўдзельнікі працэсу з юрыдычнай адукацыяй выдатна бачаць і разумеюць, што адбываецца. Я толькі хачу падзякаваць сваім родным, сябрам, таварышам-анархістам, журналістам, праваабаронцам, усім неабыякавым, усім, хто шануе маю працу, за тое, што падтрымлівалі мяне на працягу гэтага года і дапамагалі матэрыяльна. Гэта вельмі важна для мяне. Ну а ўсім, хто мае дачыненне да арганізацыі гэтага судовага працэсу, а роўна і іншых палітычных рэпрэсій у **маёй** краіне, я хачу сказаць: не майце ілюзій! Ніякія напісаныя вамі паперкі, ніякі тэрор ня здольныя спыніць вызваленне чалавека і прагрэс. Мы ўсё роўна пераможам!"*

Прысуд будзе абвешчаны 10 лістапада ў 10:00.

У чым абвінавачваюць палітвязня?

Па дадзеных следства, днём 23 жніўня 2020 года Мікалай Дзядок прыняў актыўны ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве ў Мінску, падчас якога, "усведамляючы супрацьпраўнасць сваіх дзеянняў і аказваючы відавочнае непадпарадкаванне законным патрабаванням супрацоўнікаў міліцыі, ён разам з неўстаноўленымі асобамі парушаў грамадскі спакой і блакаваў руху транспарту".

Згодна з матэрыяламі крымінальнай справы, Мікалай Дзядок на працягу некалькіх гадоў адміністраваў радыкальны тэлеграм-канал "**Mikola**". Па матэрыялах справы, "*для прычынення шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь Дзядок неаднаразова распаўсюджваў розныя матэрыялы на кіраваным ім тэлеграм-канале выкарыстоўваючы метады, накіраваныя на дэстабілізацыю абстаноўкі ў краіне, штучнае нагнятанне напружанасці і супрацьстаяння ў грамадстве, распаўсюджванне ідэалогіі экстрэмізму*". **Такія заклікі пачаліся з 4 жніўня**.

Падчас затрымання ў ходзе ператрусу жылля выяўленыя і канфіскаваныя шкляныя бутэлькі з гаруча-змазачнымі матэрыяламі, якія згодна з заключэннем эксперта ГКСЭ з'яўляюцца прадметамі, якія дзейнічаюць на выкарыстанні гаручых рэчываў.

Такім чынам, Мікалаю Дзядку прад'яўленае абвінавачванне па:

- ч. 1 арт. 342 (актыўны ўдзел у дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак і спалучаных з відавочным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікам улады, што пацягнула парушэнне працы транспарту);
- ч. 2 арт. 361 (распаўсюд матэрыялаў, якія змяшчаюць заклікі да здзяйснення дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, з выкарыстаннем глабальнай сеткі Інтэрнэт);
- ч. 1 арт. 295-3 (незаконныя дзеянні ў дачыненні да прадметаў, дзеянне якіх заснавана на выкарыстанні гаручых рэчываў) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Мікола не прызнаў віну ні па ніводным артыкуле.

Храналогія суда над палітзняволеным Мікалаем Дзядком:



У Мінгарсудзе пачалі судзіць палітзняволенага Мікалая Дзядка. Ён не прызнае віну

Мікола будзе дапытаны напрыканцы судовага следства пасля допыту сведак і даследвання ўсіх матэрыялаў справы.



Душылі падушкай, засоўвалі бутэльку ў рот. На судзе палітвязень Дзядок распавёў пра катаванні і збіццё

У Мінскім гарадскім судзе 1 ліпеня адбываецца другое паседжанне па крымінальнай справы супраць 32-гадовага палітзняволенага блогера і актывіста анархічнага руху Мікалая Дзядка.



Па справе Мікалая Дзядка прызначылі судовую псіха-лінгвістычную экспертызу. У судзе абвешчаны перапынак на час яе правядзення

У Мінскім гарадскім судзе 5 ліпеня працягваецца суд па крымінальнай справы супраць 32-гадовага палітзняволенага блогера і актывіста анархічнага руху Мікалая Дзядка.

Твитнуть




Вясна. Правы чалавека ў …
9 920 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА
"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

